**УДК 94(5)**

# ЖЫЛЛЁВА-ГАСПАДАРЧЫЯ КОМПЛЕКСЫ X–XVIII СТСТ. НІЖНЯГА ЗАМКА ПОЛАЦКА (ПА ВЫНІКАХ РАСКОПАК 2014 ГОДА)

***А.Л. КОЦ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Археалагічныя даследаванні стрэлкі Ніжняга замка ў Полацку былі праведзены ў 2014 годзе. Падчас раскопак даследаваліся культурныя напластаванні X–XVIII стст. і больш ранняга перыяду, старажытныя могілкі, матэрыяльная культура палачан, будаўнічы матэрыял храма XII ст і інш. У раскопе зафіксавана 17 жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Умовы культурнага слою не захоўваюць тут арганічных рэчываў, таму комплексы вылучаліся па рэшткам печаў, плямам культурнага пласта, мацерыковым ямам, канцэнтрацыі керамікі (развалам гаршкоў) у гаспадарчай прасторы і інш. Найбольшая колькасць зафіксаваных комплексаў прыпадае на перыяд X–XIII стст. У канструкцыях печаў старажытнарускага перыяду акрамя камянёў і гліны выкарыстоўваліся фрагменты плінфы. У пач. XVI ст. з’яўляюцца дамы на каменным падмурку. Стрэлка Ніжняга Замка ў XVII–XVIII стст. не вызначаецца актыўнай забудовай. На гэты перыяд прыпадае канчатковае разбурэнне храма XII ст.*

***Ключавыя словы***: *Полацк, Ніжні замак, стрэлка Ніжняга замка, жыллёва-гаспадарчы комплекс, печ.*

**Уводзіны.** Ніжні замак з’яўляецца надзвычай цікавым археалагічным помнікам Полацка. На тэрыторыі замка фіксуюцца культурныя напластаванні і археалагічныя знаходкі ад пачатку засялення тэрыторыі горада ў жалезным веку да нашага часу. Акрамя таго, дадзеная тэрыторыі спазнала найбольш актыўныя тапаграфічныя змены ў сувязі са шматлікімі перабудовамі.

Летам і восенню 2014 г. на тэрыторыі так званай стрэлкі Ніжняга замка старажытнага Полацка праводзіліся археалагічныя раскопкі. Даследаванні ажыццяўляліся Д.У. Дукам і А.Л. Коцам на падставе Дазвола па форме № 1 № 2705, выданага на імя Д.У. Дука Інстытутам гісторыі НАН Беларусі. Помнік знаходзіцца ў самай паўночнай частцы Ніжняга замка на стромкім беразе р. Палаты (вышыня ад урэзу вады 25 м) і выступае мысам у бок старажытнага полацкага гарадзішча. Быў закладзены раскоп Г-падобнай формы агульнай плошчай 162 м$^2$. Памеры раскопа 12 × 18 м. Умоўна ён быў падзелены на тры часткі: заходнюю, усходнюю і паўднёвую. Раскоп разбіты на квадраты памерам 2 × 2 м і мае наступную нумарацыю: па лініі поўнач-поўдзень квадраты нумаруюцца ад 1 да 9, па лініі захад-усход – ад А да Е. Верхнія напластаванні XIX–XX стст. былі зняты тэхнікай загадзя да пачатку раскопак. Разборка культурнага слоя ажыццяўлялася па ўмоўным пластам (0,2 м). Пасля кожнага знятага пласта праводзілася зачыстка і фіксацыя аб’ектаў гарызантальнай стратыграфіі. Агулам налічваецца 6 ўмоўных пластоў.

**Гісторыя помніка археалогіі.** Найбольш раннія знаходкі з дадзенай тэрыторыі датуюцца перыядам жалезнага веку. Менавіта падчас згаданых раскопак была знойдзена кераміка днепра-дзвінскай культуры і фібула III ст. н.э. Асобныя знаходкі (гліняныя прасліца і кераміка) сведчаць аб прысутнасці тут прадстаўнікоў банцараўска-тушамлінскай культуры. Па выніках раскопак у 2008 г. і ў 2014 г. было высветлена, што ў трэццяй чвэрці I тыс. на дадзенай тэрыторыі існавала селішча пры гарадзішчы. Русла Палаты, якое сёння аддзяляе стрэлку Ніжняга замка ад гарадзішча, у той час яшчэ не існавала. Археалагічныя знаходкі выразна сведчаць аб перыядзе пражывання насельніцтва культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганаў у канцы I тыс. н.э. У больш позні час пляцоўка Ніжняга замка пераўтвараецца ў селішча-перадграддзе пры Полацкім гарадзішчы (дзяцінцы). У першай палове XI ст. селішча-перадграддзе разрастаецца ў гарадскі пасад, які атрымлівае назву Вялікі. На перыяд XII–XIII стст. прыпадае асноўная інтэнсіўнасць жыцця на першапачатковым гарадзішчы, дзе размяшчалася княжаская рэзідэнцыя і дамы багатых палачан [2, с. 58; 1, с. 23]. У сувязі з гэтым у XII ст. на акрэсленай тэрыторыі побач з гарадзішчам узводзяць мураваны храм, пры якім у далейшым былі арганізаваны могілкі. Магчыма, што разбурэнне гэтага храма, помніка полацкай школы дойлідства XII ст., прыпадае на XVII ст.

У сярэдзіне XVI ст., калі Полацк у часе Інфлянцкай вайны быў захоплены маскоўскімі войскамі Івана Грознага, адбываюцца маштабныя тапаграфічныя змены цэнтральнай часткі горада, адным з вынікаў якіх было ўзвядзенне Ніжняга замка. Паміж Вялікім пасадам і гарадзішчам было пракладзена новае русла Палаты, а таксама быў узведзены магутны вал вакол Ніжняга замка. Падчас пракопвання русла паўднёвая ўскраіна гарадзішча і частка стрэлкі Ніжняга замка былі знішчаны. Слой чырвонай гліны, які быў выўялены падчас раскопак у 2008 г., з’яўляецца маркерамі будаўніцтва вала Ніжняга замка

[1, с. 22]. У раскопе 1 (2014 г.) аднародны слой гліны не зафіксаваны. Тут гліна размешчана дысперсна, у выглядзе плямаў і лінзаў (магутнасцю да 0,2 м). Найбольшая канцэнтрацыя дадзеных плямаў і лінзаў каля заходняй сценкі раскопа, у непасрэднай блізасці да раскопа 1 (2008 г.). Магчыма, з гліны былі зроблены падсыпкі для нівеліроўкі пляцоўкі стрэлкі Ніжняга замка. Таксама дадзены тэзіс падцвярджаюць матэрыялы С.В. Тарасава, які азначае, што слой гліны пакладзены на розных глыбінях і мае магутнасць ад 0,1 м да 0,4 м [6, с. 26]. Азначаны пласт выразна падзяляе стратыграфію на "далівонскі" і "паслялівонскі" перыяды.

**Гісторыя археалагічнага вывучэння помніка.** Археалагічнае вывучэнне стрэлкі Ніжняга замка было распачата Г.В. Штыхавым у 1962 г., які шляхам шурфоўкі зафіксаваў магутнасць культурных нап-ластаванняў. Ён сумесна з М.К. Каргерам даследаваў завал плінфяной канструкцыі, якая, па іх меркаванню, магла быць рэшткамі мураванага храма [7]. Іх працу працягнуў П.А. Рапапорт у 1976–1977 гг. Ім было закладзена некалькі шурфоў і раскоп на месцы храма. Па выніках раскопак П.А. Рапапорт зрабіў варыянт рэканструкцыі царквы [5]. Далей даследаванні тут былі праведзены С.В. Тарасавым у 1989 г. У 2008 г. Д.У. Дукам побач з заходнім схілам помніка была раскапана пляцоўка плошчай 40 м$^2$. У раскопе выразна зафіксавана стратыграфія помніка і выяўлены 2 жылёва-гаспадарчыя комплексы [3, с. 18, с. 21].

**Стратыграфія культурных напластаванняў раскопа 2014 г.** Культурны слой на стрэлцы Ніжняга замка можна падзяліць на 3 стратыграфічныя гарызонты: другая палова XVI–XVIII стст., XIV–першая палова XVI стст., X–XIII стст. У раскопе 1 2014 г. выяўлена 17 жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Жыллёва-гаспадарчы комплекс (далей – ЖГК) – гэта шэраг пабудоў адной сядзібы, асобныя будынкі ці іх часткі (рэшткі печы, плямы культурнага пласта, мацерыковыя ямы, развалы гаршкоў і інш.), якія могуць маркіраваць пабудовы. Як правіла, яны аб'яднаны агульнай калекцыяй знаходак (індывідуальных і масавых) і маюць вузкія храналагічныя межы, у палявой дакументацыі жыллёва-гаспадарчыя комплексы вызначаліся як археалагічныя аб'екты ці мацерыковыя ямы.

З-за дрэннай захаванасці арганічных матэрыялаў і шматлікіх перабудоў, якія закранулі стэлку Ніжняга замка ў XVI–XVIII стст., памеры сядзібных надзелаў на дадзенай тэрыторыі вызначыць не атрымалася.

Усе жыллёва-гаспадарчыя комплексы падзелены таксама на тры групы адносна трох стратыграфічных гарызонтаў. Колькасць ЖГК размеркавана наступным чынам: 1 гарызонт – 2 ЖГК, 2 гарызонт – 5 ЖГК, 3 гарызонт – 10 ЖГК. Для спрашчэння апісання ў назве кожнага жыллёва-гаспадарчага комплекса прысутнічаюць 2 лічбы. Першая лічба азначае парадкавы нумар комплекса, другая лічба пазначае, да якога стратыграфічныга гарызонту ён адносіцца, напрыклад, жыллёва-гаспадарчы комплекс 3–1 (ЖГК 3–1).

Вылучэнне ЖГК зроблена без прывязкі адзін да аднаго, г. зн. вызначаныя аб'екты не сінхранізаваныя паміж сабою. Пры даследаванні жыллёва-гаспадарчых комплексаў ужываўся ўсебаковы аналіз кожнага вылучанага аб'екта: разглядаліся стратыграфічныя напластаванні ў сукупнасці з індывідуальнымі і масавымі знаходкамі. Асноўнай крыніцай па вызначэнні храналогіі комплесаў выступае керамічны матэрыял (табл. 1).

*Верхні (першы) стратыграфіны гарызонт* складаецца са слою светлашэрага колеру і праслоек чырвонай гліны. У цэнтры паўднёвай часткі ён моцна пашкоджаны перакопамі ад пахаванняў. Сярэдняя магутнасць першага стратыграфічнага гарызонта каля 0,4 м (на асобных аб'ектах да 0,6 м), без уліку ям, якія даходзяць да мацерыковай паверхні. Праслойкі аднароднай гліны перыяду Лівонскай вайны зафіксаваны ў паўднёва-заходнім куце раскопа памерам 2,5 × 2,3 м і каля паўночнай сценкі раскопа памерам 1 × 1,9 м. Магутнасць праслоек вагалася ў межах 0,1–0,3 м. У іншых выпадках дробныя лінзы чырвонай аднароднай гліны фіксаваліся па ўсёй плошчы раскопа. Пад глінай сустракаюцца праслойкі цёмнакарычневага колеру з чырвонай глінай. У паўднёва-заходнім куце раскопа ў гэтым слое фіксуюцца і кавалкі вугалю.

На дадзеным месцы, у кв. А4, А5, Б4, Б5, В5, вызначаны рэшткі пабудовы (ЖГК 3–1), якую вызначае пляма гумусавага слою зямлі з кавалкамі гліны і ўкрапінамі вуглю. Асобныя межы пабудовы акрэсліваюць рэшткі драўлянай канструкцыі ў выглядзе двух спарахнелых бярвенняў, якія ляжаць перпендыкулярна адзін аднаму і ў дыяганаль адносна сеткі квадратаў. Знаходкі (мал. 1) з жыллёва-гаспадарчага комплексу прадстаўлены гузікам, свінцовай куляй, цвіком падкавякам, іголкай, рыбалоўным кручком, шарыкам для гульні, фрагментам нажа, фрагментам стрэмені, нажом з прыкметамі другаснага выкарыстання, касцяной порхліцай, дэкаратыўным цвіком. Масавы матэрыял (фрагменты керамічнага посуду) вызначае час датавання ЖГК 3–1 ў межах другой паловы XVII стст. Гумусавы культурны слой з украпінамі вуглю і шмат керамікі вызначаюць пабудову жылую, альбо для захавання прыпасаў.

**Табліца 1. – Распаўсюджанне венцаў керамічных гаршкоў па жыллёва-гаспадарчым комплексам з раскопа 1 на Ніжнім замку ў 2014 г.**

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тыпы венцаў |  | | | | | | | | | | | | |
| ЖГК 1-1 | 19 | 6 | 5 | 14 | 6 | | | | | | | | |
| ЖГК 2-2 | | | | | | 3 | 3 | 2 | | | | | |
| ЖГК 4-2 | | | | | | | | | 2 | 2 | 2 | 2/2 | 2 |
| Тыпы венцаў |  | | | | | | | | | | | | |
| ЖГК 5-2 | 9 | 17 | 11 | 7 | 4 | 6 | 3 | 2 | | | | | |
| ЖГК 6-2 | | | | | | | | | 7 | 5 | 5 | 6/4 | 2 |
| Тыпы венцаў |  | | | | Ляпное | | | | | | | | |
| ЖГК 7-2 | 7 | 7 | 9 | 5 | | 4 | 2 | | 1/5 | | 4 | 5 | 1 |
| ЖГК 8-3 | 2 | | 11 | 4 | 2 | | | | 6/2 | 7 | 2 | | |
| ЖГК 9-3 | | | 5 | | | 1 | | | 5/- | 1 | | | |
| ЖГК10-3 | 1 | | | | | | 1 | | | 1 | 3 | | |
| ЖГК 11-3 | | | | 1 | 2 | | | | 2/3 | | 2 | 1 | 4 |
| ЖГК 12-3 | | | | | 1 | | | 2 | -/2 | | | | 2 |
| ЖГК 13-3 | | | | | | | | | | 1 | | | |
| ЖГК 14-3 | | | | 2 | | | | | 3/2 | | 7 | | 1 |
| ЖГК 15-3 | | | 3 | | | | | | 1/2 | | 10 | 2 | 5 |
| ЖГК 16-3 | | | | | 1 | | | 4 | -/3 | 1 | | | |
| ЖГК 17-3 | | | | | | | | | 2/- | | | | |




**Малюнак 1. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 3-1**

У кв. Е3, Е4, Е5, Е6, Е7 зафіксавана канструкцыя позняга паходжання, якая маркіравана як аб’ект 1 (ЖГК 1–1) (мал. 2:1). У кв. Е3 і Е7 (умоўны пласт 2) выяўлены рэшткі падмуркаў у выглядзе выкладзеных у шэраг камянёў. Шэрагі камянёў выцягнуты па лініі захад-усход на даўжыню да 2 м ад усходняй сценкі раскопа. Камяні падмуркаў кв. Е3 дадаткова зафіксаваны фрагментамі плінфы. Даўжыня канструкцыі перывашае 9 м. Прастора паміж падмуркамі ў азначаных квадратах запоўнена слоем дробна-бітай цэглы (плінфы?) з вапнавай рошчынай-цамянкай і фрагментамі фрэсак. На месцы дадзенай канструкцыі выяўлены шэрагі ўпускных пахаванняў. У квадратах па лініі Д (кв. Д3, Д4, Д5, Д6, Д7) шчыльнасць бітай цэглы з вапнай зніжаецца, але складае значную частку культурнага слою. Дадзенае запаўненне пабудовы вызначае адзін з этапаў разбурэння царквы. На захад ад ЖГК 1–1, у кв. Д4 і Г4, выяўлена адмостка з плінфы (маркіравана як аб’ект 3) (мал. 2:1). Аб’ект знаходзіцца ў непасрэднай блізасці да апісанай пабудовы. Плінфа пакладзена ў два рады на вапнавую рошчыну. Паказальна, што ў аб’екце 3 старажытная цэгла выкарыстоўвалася другасна. Пераважна ўся плінфа бітая, цэлых фрагментаў не зафіксавана. Некаторыя кавалкі плінфы былі разламаны і крышыліся. Памер зафіксаванага аб’екту 1 × 1,5 м. Паміж цаглінамі знойдзены жалезныя ключык, лучнік, шкляны слоік, а таксама фрагменты плінфы са знакамі на тарцах (мал. 3). Магчыма, што плінфяную вымастку можна вызначыць як ганак пабудовы (ЖГК 1–1). Прызначэнне ЖГК 1–1 не вызначана. Паводле археалагічных знаходак і стратыграфіі культурнага пласта датаваць яго можна ў межах XVII ст.

*Сярэдні (другі) стратыграфічны гарызонт* мае сярэднюю магутнасць да 0,6 м. У паўднёва-ўсходнім куце раскопа фіксуецца слой з бітай цэглы (плінфы?) і вапнавай рошчыны без дамешак. Ён перакрывае слой зямлі чорнага колеру, які пашкоджаны пахаваннямі. У ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонта (чацвёрты ўмоўны пласт) у паўднёва-ўсходнім куце раскопа выяўлены шэраг пахаванняў, якія пакладзены вельмі шчыльна адно да аднаго, і шмат костак, якія не маюць анатамічнага парадку (перадкладзеныя). Агулам, увесь слой зямлі другога гарызонта чорнага колеру з дамешкамі кавалкаў гліны і вугалю.



**Малюнак 2. – Планіграфія культурнага слоя на ўзроўні ўмоўных пластоў 2 (1) і 3 (2)**



**Малюнак 3. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 1-1**



**Малюнак 4 – Адзіночныя венцы керамічных гаршкоў з ЖГК 2-2**

У межах другога стратыграфічнага гарызонту ў паўночна-ўсходнім куце зафіксавана дзве пабудовы, якія перакрываюць адна адну. Пасля зачысткі першага ўмоўнага пласта ў кв. Г1, Г2, Д1, Д2 зафіксаваны рэшткі драўлянай канструкцыі (ЖГК 2–2, аб’ект 2) у выглядзе спарахнелых бярвенняў ці плах, пакладзеных перпендыкулярна адзін да аднаго. Побач з імі прасочваюцца лінзы абпаленай гліны з вуголлем. Сляды дадзенай канструкцыі выяўлены і на ўзроўні другога ўмоўнага пласта ў выглядзе вялікай бясформенай плямы абпаленай гліны з кавалкамі вугля, асобнымі лінзамі вуглю і попелу (гл. мал. 2:1). Памер зафіксаванай канструкцыі 3,4 × 2,5 м. Магутнасць залягання абпаленай чырвонай гліны да 0,3 м. Дадзены жыллёва-гаспадарчы комплекс паводле керамікі (мал. 4, табл. 1) датуецца перыядам XVI ст. Але, улічваючы асаблівасці фарміравання культурнага пласта і гістарычных рэалій, яго храналагічныя межы можна абмежаваць першай паловай XVI ст. (далівонскім перыядам). Наяўнасць печы ў комплексе вызначае жылое прызначэнне пабудовы. Аб’ект 5, кладка з плінфы другаснага выкарыстання ў кв. Е1, відавочна, з’яўляецца часткай падмурка ЖГК 2–2. Таксама дадзеная пабудова пастаўлена на рэшткі папярэдняй канструкцыі (ЖГК 6–2), якую цалкам перакрывае.

Жыллёва-гаспадарчы комплекс 6–2 ускрыты часткова ў межах кв. Г1, Д1, Д2, Е1, Е2 (мал. 2:2, 5:1). Памер выяўленай часткі аб’екта 3,4 × 4 м. Аб’ект выцягнуты па лініі захад-усход з невялікім адхіленнем на паўднёвы-захад. Цэнтральная частка пабудовы запоўнена цёмнашэрым слоем з кавалкамі вуглю і гліны. У кв. Г1 і Д1 каля сценкі раскопа выяўлены лінзы чырвонай абпаленай гліны і гліны з вуглем (гл. мал. 2:2). Магчыма, гэта рэшткі печы. Пад вызначанай лінзай гліны знойдзены дзве манеты, пакладзеныя разам. У кв. Е2 каля ўсходняй сценкі раскопа выяўлены рэшткі канструкцыі з фрагментаванай плінфы другаснага выкарыстання. Зруб пабудовы быў пастаўлены на каменны падмурак. Камяні ад падмурка захаваліся ў выглядзе выкладзенай у адзін рад асновы ў кв. Е2 і Д2 (гл. мал 5:1). Магчыма, што частка канструкцыі з плінфы ў кв. Е2 з’яўляецца працягам падмурка пабудовы. Памеры камянёў 0,25–0,5 м у папярэчніку. Яшэ адзін камень памерам да 0,4 м выяўлены каля рэштак печы. У межах пабудовы ў цэнтры кв. Е1 зафіксавана лінза вугалю авальнай формы (выцягнута па лініі захад-усход) памерам 0,9 × 0,6 м. Знаходкі (мал. 6) з пабудовы прадстаўлены нажамі, манетай, фрагментам меднага вырабу, ледаходным шыпом, гаспадарчым кручком, зашчапкай, фрагментам пласцінчатага бранзалета, фрагментам пісанкі, фрагментам шклянога бранзалету, рамонтнай пласцінкай, пісалам, фрагментам меднага бранзалета, нажом, ігральнай косткай, клямкай, засовам нутранога замка, залатой завушніцай і інш. Відавочна, што асобныя археалагічныя знаходкі паходзяць з папярэдняга гарызонта. Сабраны матэрыял сведчыць аб заможнасці гаспадароў і іх статуснасці. Манеты, якія былі выяўлены пад слоем гліна ад печы пражскі, – грош Вацлава IV і дынары Аляксандра (1492–1506 гг.) – датуюць будаўніцтва жылога комплексу ў межах першага дзесяцігоддзя (пачатку) XVI ст.[1]




**Малюнак 5 – Планіграфія культурнага слоя на ўзроўні ўмоўных пластоў 4 (1) і 5 (2)**

[1] Выказваем шчырую падзяку выкладчыку Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы А.В. Карачу за вызначэнне нумізматычнага матэрыялу.




**Малюнак 6 – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 6-2**

На ўзроўні другога і трэццяга ўмоўных пластоў у кв. А1 і Б1 выяўлена пляма чорнага гумусавага слою (аб'ект 6) з кавалкамі гліны (жыллёва-гаспадарчы комплекс 5–2) (гл. мал. 2). У цэнтры аб'екта размяшаецца акруглая пляма аднароднай чырвонай абпаленай гліны. Каля паўночнай сценкі раскопа ў межах ЖГК 5–2 выяўлена пляма прамакутнай формы чорнага аднароднага слою з вуглем з утрыманнем вялікай колькасці фрагментаў керамічнага посуду (гаршкі, накрыўкі, макотра і інш) (гл. табл. 1). У запаўненні апошняй выяўлены невялікія камяні (да 0,15 м у папярэчніку), размешчаныя дысперсна. Магутнасць культурнага слою аб'екта дасягае 0,4 м. Індывідуальныя знаходкі (мал. 7) прадстаўлены фрагментам нажа, апрацаваным рогам, які расколаты на дзве паловы, шыферным прасліцам, нявызначаным медным прадметам, цвікамі, ледаходным шыпом, шлакам, жалезным прадметам і аплаўкамі з каляровага металу. Відавочна, што дадзены аб'ект з'яўляецца месцам сфарміраванай гаспадарчай прасторы ў жылой пабудове. Паводле масавых і індывідуальных знаходак яго можна датаваць XIV–XV стст.

На ўзроўні другога і трэццяга ўмоўных пластоў у кв. А3 выяўлена пляма прамакутнай формы памерам 1,5 × 2,1 м (ЖГК 4–2) (гл. мал. 2). Яна ўскрыта часткова, паколькі выходзіла за межы раскопа. Канструкцыя ўнутры запоўнена гумусам з кавалкамі вугля, гліны і вапны. Па контуру яе акаймоўвае паласа (шырынёю да 0,2 м) чорнага аднароднага слою з лінзамі вуглю і абпаленай гліны. На ўзроўні трэццяга ўмоўнага пласта пляма мае чорны гумусавы колер з украпінамі пяску. Знаходкі (мал. 8) прадстаўлены медным нявызначаным вырабам, шпількай і фрагментамі керамікі. Відавочна, канструкцыя мае гаспадарчае прызначэнне. Невялікага памеру памяшканні маглі выкарыстоўвацца для ўтрымання дробнай жывёлы або хатняй птушкі. Паводле сабраных фрагментаў посуду яна датуецца XIII–XIV стст.




**Малюнак 7 – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 5-2**




**Малюнак 8. – Знаходкі з каляровага металу і керамкі з жыллёва-гаспадарчага комплексу 4-2**

У паўднёва-заходнім куце (кв. А4, А5, Б3, Б4, Б5, В4, В5; умоўны пласт 4) прасочваецца пляма прамакутнай формы культурнага слою чорнага колеру з кавалкамі вугалю і лінзамі пяску (сляды пабудовы?). У цэнтральнай частцы захоўваюцца лінзы пяску і вугалю, а таксама чорны слой з кавалкамі гліны. Пляма выцягнута па лініі паўднёвы-захад–паўночны-ўсход (жыллёва-гаспадарчы комплекс 7–2) (гл. мал. 5:1). Памер зафіксаванай часткі плямы 4,6 × 5,52 м. У кв. Б4 фіксуецца канцэнтрацыя керамічнага матэрыялу, што, магчыма, маркіруе гаспадарчую прастору пабудовы. Выяўлены наступныя знаходкі (мал. 9): абоймiца, шкляны бранзалет, ключ, прасліца, гузік, чашуйка Міхаіла Фёдаравіча, наканечнік стралы, пярсцёнкі, пацерка, нож і інш. Масавыя матэрыялы датуюць жыллёва-гаспадарчы комплекс 7–2 у межах XIII–XIV стст.




**Малюнак 9. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 7-2**

*Ніжні (трэці) стратыграфічны гарызонт*. У слое X–XIII стст. выяўлены не менш 10 жыллёва-гаспадарчых комплесаў. Іх маркіруюць шэраг развалаў канструкцый з камянёў або абпаленай гліны, мацерыковыя ямы і плямы культурнага слоя з комплексам знаходак.

Сярэдняя магутнасць культурнага слою ніжняга стратыграфічнага гарызонта складае 0,3–0,4 м, ніжніх напластаванняў трэццяга стратыграфічнага гарызонта – 0,1–0,2 м. Магутнасць культурнага пласта ў паглыбленні ў кв. Г2, Г3, Д2, Д3, Е2, Е3 дасягае 0,6–0,8 м.

Верхняя частка трэццяга стратыграфічнага гарызонта не вылучаецца аднароднасцю напластаванняў. У ёй зафіксаваны большасць каменных канструкцый, якія можна вызначыць як рэшткі агнішчаў і печаў. Такіх аб’ектаў налічваецца не менш шасці (гл. мал. 5:2).

На ўзроўні ўмоўнага пятага пласта зафіксаваны рэшткі печы-каменкі (ЖГК 8–3, аб’ект 7), якая плаўна перахозіць у мацерыковую яму 7 (мал. 5:2, 10:2). Аб’ект выяўлены ў заходняй частцы кв. А3, А4 і выцягнуты ўздоўж заходняй сценкі раскопа. Ён уяўляе сабой развал камянёў, пакладзеных на слой насычанага чорнага колеру з вуглем. Памеры камянёў 0,1–0,15 м у папярэчніку. З усходняга боку да аб’екта прымыкае лінза чырвонай гліны (форма прыбліжана да чарытохкутніка з закругленымі вугламі) памерам 0,25 × 0,35. З паўночна-ўсходняга боку выяўлена бясформенная пляма (памерам 1 × 0,75 м) чорнай зямлі насычанага колеру з кавалкамі чырвонай неабпаленай гліны і вугалю. Знаходкі прадстаўлены рэшткамі керамічнага посуду (мал. 11:1, табл. 1), якія дазваляюць датаваць яго ў межах старажытнарускага перыяду.




**Малюнак 10. – Планіграфія аб’ектаў мікрастратырафіі ўмоўнага пласта 6 (1) і выяўленых мацерыковых ям і рэльефу мацерыка (2)**

Жыллёва-гаспадарчы комплекс 9–3 (па палявой дакументацыі аб’ект 8) – рэшткі глінабітнай печы ў кв. А2, выяўленыя на ўзроўні пятага ўмоўнага пласта (гл. мал. 5:2). Гэта кавалкі абпаленай гліны ў форме прамакутніка памерам 1 × 0,3 м з дробнымі камянямі (памерам да 0,1 м у папрэчніку). Аб’ект выцягнуты па лініі паўночны-захад – паўднёвы-ўсход. Вышыня рэшткаў печы дасягае 0,2 м. Побач з канструкцыяй (з заходняга боку) выяўлены фрагмент плінфы, рэшткі спарахнелага дрэва. Знаходкі прадстаўлены косткамі жывёл і керамічнымі матэрыяламі (мал. 11:2, табл. 1). Печ, якая існавала непрацяглы час, датуецца XII–XIII стст.




**Малюнак 11. – Адзіночныя фрагменты гаршкоў з жыллёва-гаспадарчых комплексаў 8-З (1), 9-З (2), 11-З (3)**

Рэшткі печы выяўлены ў кв. Г2 і Д2 на ўзроўні пятага (мал. 5:2) і шостага ўмоўных пластоў (жыллёва-гаспадарчы комплекс 10–З). Памер асновы печы 0,5 × 0,8 м. Печ была пастаўлена на падсыпку з мацерыковага пяску. У канструкцыі печы прысутнічаюць камяні памерам да 0,2 м у папярэчніку, пакладзеныя на гліну, і дрэва (захавалася фрагментарна ў выглядзе абгарэўшых дошак таўшчынёю да 2 см і бярвенняў дыяметрам да 0,15 м). Прастора паміж камянямі запоўнена чорнай зямлёй з вуголлем. Побач з печчу (з заходняга боку) выяўлены шэраг гаспадарчых рэчаў (мал. 12): скруткі бяросты, фрагменты прыстасавання для ткацтва(?), жалезнае кальцо, 3 шыферныя прасліцы і іншыя жалезныя прадметы. Скапленне рэчаў у адным месцы можна вызначыць як месца захоўвання гаспадарчых прыладаў характэрных для жаночай працы (што цікава – каля печы!). Комплекс знаходак маркіруе рабочую прастору гаспадыні. У запаўненні аб'екта прысутнічаюць фрагменты ляпных і пераважна ганчарных керамічных гаршкоў (гл. табл. 1). Паводле комплексу знаходак ЖГК 10–З можна датаваць у межах XIII ст.




**Малюнак 12. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 10-З**

За 1 м на захад ад ЖГК 10–З, у кв. В2 і кв. Г2 выяўлены рэшткі печы-каменкі (жыллёва-гаспадарчы комплекс 11–З), якія маркіраваны па палявой нумарацыі як аб'ект 12 (гл. мал. 5:2). Печ мае авальную форму, выцягнутую па лініі поўнач-поўдзень. Памеры асновы печы 0,6 × 0,4 м. Вышыня выяўленых рэшткаў печы дасягала 0,3 м. Печ была зроблена з камянёў памерам 0,1–0,2 м у папярэчніку, асобныя камяні дасягаюць памеру 0,25–0,3 м. Печ пастаўлена на роўную аснову з чорнага культурнага слою без падсыпак. Камяні пакладзены шчыльна адзін да аднаго без рошчыны ці гліны, прастора паміж камянямі запоўнена чорнай зямлёй з вуглём. Паміж камянямі выяўлены фрагменты керамічнага посуду, у тым ліку адно венца з яскрава выражанай манжэтай, якое можна датаваць XII ст. (гл. мал. 11:3, табл. 1). Ніжэй печы-каменкі была выяўлена мацерыковая яма 26, якая мае больш ранняе паходжанне і з'яўляецца часткай жытла. Яна вызначана як ЖГК 16–З. Відавочна, што два дадзеныя аб'екты не маюць паміж сабой сувязі. Мацерыковая яма 26 размяшчаецца ў кв. Б1, Б2, В1, В2, Г1, Г2 (гл. мал. 10:2). Форма ямы прыбліжана да круглай (нязначна выцягнута па лініі захад-усход). Яма мае плоскае дно ў цэнтральнай

частцы (набольш глыбокая частка з паўночна-заходняга боку) і адзін уступ. Глыбіня ў цэнтральнай частцы ад узроўню мацерыка 0,65 м. Памер ямы: 3,16 м па лініі поўнач-поўдзень і 3,42 м па лініі захад-усход. Яма запоўнена паслойна чорнай зямлёй з вуглём і кавалкамі гліны, пяском і глінай. На дне ямы маецца праслойка цёмна-шэрага аднароднага слою. У заходняй частцы па контуру зафіксавана паласа чорнага арганічнага рэчыва таўшчынёю да 0,03 м на глыбіню 0,1 м. Падобная праслойка магла ўтварыцца ад спарахнелых дошак, якімі была выстаўлена верхняя частка ямы. У заходняй частцы ямы выяўлена лінза (таўшчыня 0,1 м, даўжыня 0,6 м), злёгку абпаленая глінай і белым пяском. У заходняй частцы зафіксавана пляма памерам 0,3 × 0,35 м з белага пяску з дамешкамі чорнай зямлі. Ва ўсходняй частцы яма зверху перакрыта слоем белага мацерыковага пяску магутнасцю 0,1 м, які распаўсюджваецца на кв. Г2, Д3, Е2, Д3, Д4. У ЖГК 16–3 выяўлены дзве касцяныя зашпількі і шэраг фрагментаў керамічных гаршкоў XI–XII стст., косткі жывёл, у невялікай колькасці ляпная кераміка, злепкі абпаленай гліны (мал. 13, табл. 1). Датаваць дадзены комплекс можна перыядам другой паловы (канца) X–XI стст.




**Малюнак 13. – Знаходкі з косці (1,2), ляпная (3-7) і загладжаная на ганчрным коле (8) кераміка з жыллёва-гаспадарчага комплексу 16-3**

На поўдзень ад ЖГК 16–3 выяўлены яшчэ адзін жыллёва-гаспадарчы комплекс 15–3 (гл. мал. 5:2, 6:2). Яго сляды прадстаўлены аналагічнай мацерыковай ямай круглай формы. Яма 23 была выяўлена на ўзроўні пятага ўмоўнага пласта і размяшчалася ў кв. Г3, Г4, В3, В4. Памер ямы 2,4 × 2,5 м. Вызначана, што яма запаўнялася паступова (паслойна). Глыбіня ямы ў цэнтры дасягае 0,9 м. Яна мае плаўны ўступ па ўсяму контуру, які больш яскрава фіксуецца ў заходняй частцы ямы. Зафіксавана 4 стратыграфічныя праслойкі. Верхняя (першая) і трэццяя (ад верху) праслойкі зямлі цёмна-карычневага колеру з глінай, дамешкамі мацерыковага пяску і вапны (магутнасць да 0,2 м кожная) утварыліся са спрасаванага слою гною. Праслойка (другая) магутнасцю да 0,05 м паміж імі ўтварылася з чорнага спрасаванага слою з дамешкамі вапны і гліны. Ва ўсходняй частцы ямы другая праслойка мае лінзу белага мацерыковага пяску магутнасцю да 0,1 м. Чацвёртая стратыграфічная праслойка складаецца з дзвюх частак. Верхняя – гэта тонкі слой чорна-карычневай гумусавай зямлі, які ўтварыўся ад перагнівання дошак, яго магутнасць каля 0,1 м. У ніжняй частцы чацвёртая праслойка ўтворана чорнай зямлёй і мацерыковым пяском, якія перамешаны ў заходняй і паўднёвай частках. У паўночнай і ўсходняй частках ямы чацвёртая праслойка запоўнена чорным слоем зямлі з дамешкамі пераважна мацерыковага пяску і радзей чырвонай гліны. Сумарная таўшчыня чацвёртай праслойкі каля 0,3 м. На дне ў цэнтры ямы (бліжэй да паўночнага краю) зафіксавана паглыбленне да 0,15 м, памер 0,3 × 0,2 м, запоўненае чорнай зямлёй. У яме знойдзены шэраг фрагментаў керамічнага посуду (гл. табл. 1). У першай і другой праслойках прысутнічае выключна ганчарная кераміка, у той час як у трэццяй і чацвёртай праслойках сярод ганарнага фіксуеца нешматлікі ляпны посуд. Сярод іншых знаходак прысутнічаюць гаспадарчыя рэчы: жалезны ледаходны шып, жалезны скабяны выраб, каменнае прасліца (мал. 14). Відавочна, што дадзены комплекс з’яўляецца часткай гаспадарчай пабудовы, на што ўказваюць праслойкі гною, і датаваць яго можна XII–пач. XIII стст.




**Малюнак 14. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 15-3**

У кв. Е1 на ўзроўні 5-6 умоўных пластоў зафіксаваны бясформенны развал камянёў, які маркіраваны як ЖГК 12–3 (аб'ект 13) (гл. мал. 5:2, 10:1). Ён выяўлены фрагментарна, паколькі частка засталася ў сценцы раскопа. Агульны памер выяўленай часткі аб'екта 1 × 1 м. Зафіксаваная вышыня развала камянёў каля 0,15 м. Прастора паміж камянямі запоўнена чорнай зямлёй з вуглём. Усе камяні пакладзены ў адзін слой. Памер камянёў 0,1–0,2 м у папярэчніку. Пры разборы каменнай канструкцыі выяўлены фрагмент рубленай шыйнай грыўны са срэбра і фрагменты керамічнага посуду (мал. 15:6, табл. 1). На 0,1 м вышэй азначанага аб'екта былі зафіксаваны знаходкі: жалезны нож, фрагмент фібулы, шчыток пярсцёнка, пацеркі, фрагмент шклянога бранзалета, глінянае прасліца, свінцовая пломба (гл. мал. 15). Магчыма, што жыллёва-гаспадарчы комплекс 12–3 прадстаўляе рэшткі печы-каменкі, якая маркіруе жылую прастору ў доме заможнага гаражаніна XI ст.




**Малюнак 15. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 12-3**

Каля паўночнай сценкі раскопа, у кв. Г1 і Д1, вызначаны развал камянёў (ЖГК 13–3, аб'ект 14), якія часткова ўпушчаны ў мацэрыковую яму 24 (гл. мал. 5:2, 10:1, 10:2). Ён раскапаны часткова, паколькі з паўночнага боку выходзіць за межы раскопа. Магчыма, што выяўленая каменная канструкцыя з'яўляецца рэшткамі печы-каменкі. Яна ўяўляе сабой бясформенны развал камянёў (памерам да 0,2 м у папярэчніку), пакладзеныя на слой чорнай зямлі з вуглём. Памер выяўленай часткі аб'екта 0,8–0,4 м. Мацерыковая яма 24 мае форму паўкола дыяметрам 2,1 м. Максімальная зафіксаваная глыбіня – 0,4 м. Сценкі пакатыя, дно плоскае. Яма запаўнялася паэтапна. Ва ўсходняй частцы ў сценцы раскопа зафіксаваны праслойкі пяску і вуглю; у заходняй частцы – праслойка пяску, перамешанага з зямлёй. Цэнтр ямы запоўнены перадмацерыковым цёмна-шэрым слоем зямлі магутнасцю да 0,05 м. Зверху гэты перадмацерыковы слой перакрыты чорным гумусавым слоем арганічнага рэчыва, ва ўсходняй частцы яго магутнасць да 0,05 м, у заходняй – 0,15 м. Вышэй размешчаны слой цёмна-карычневай зямлі з вуглём, пяском і глінай. Знаходкі ЖГК 13–3 прадстаўлены венцамі кругавых гаршкоў, косткамі жывёл, пяццю сценкамі і адным венцам ляпнога посуду (гл. табл. 1).

Жыллёва-гаспадарчы комплекс 14–3 (аб'ект 15) зафіксаваны на скрыжаванні межаў кв. Е1, Е2, Д1 і Д2 (гл. мал. 5:2). Ён прадстаўляе сабой бясформенны развал камянёў (памерам да 0,15 м у папярэчніку), якія запоўнены чорнай зямлёй з вуголлем. Памер аб'екта 0,9 × 1,1 м. Знойдзеныя тут глінянае прасліца, шкляны бранзалет і кераміка (мал. 16, табл. 1) датуюць ЖГК XII–XIII стст.




**Малюнак 16. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 14-З**

Мацерыковая яма 27 вызначана як жыллёва-гападарчы комплекс 17–З. Яна зафіксавана ў кв. Е2 і Е3 як паглыбленне мацерыка (гл. мал. 5:2, 10:2) і ўскрыта часткова, паколькі палова яе засталася па-за межамі раскопа. Сляды мацерыковай ямы прасочваліся ад ўзроўню 5 умоўнага пласта. Яма мае складаную структуру, якая адрозніваецца шэрагам уступаў у паўночнай частцы. З паўднёвага боку сценкі ямы вертыкальныя, у іншых выпадках стромкія, дно плоскае. Даўжыня ямы па лініі ўсходняй сценкі раскопа 1,75 м. Глыбіня ямы дасягае 0,56–0,6 м. Запоўнена яма паслойна: на мацерыку залягае праслойка чорнай зямлі магутнасцю да 0,1 м, з паўночнага боку яна ўтрымлівае лінзы белага пяску. Вышэй чорную праслойку перакрывае слой шэрага пяску магутнасцю да 0,2 м, над ім сфарміраваўся слой зямлі магутнасцю да 0,15 м чорнага колеру з перагарэлымі камянямі. У верхняй частцы ямы размешчаны цёмна-шэры слой зямлі ніжняга стратыграфічнага гарызонта з глінай і вуголлем. Знаходкі з жыллёва-гаспадарчага комплексу 17–З прадстаўлены жалезнымі кольцамі (адно з дадатковымі трыма мальнькімі калечкамі), нажом, шкляной пацеркай, прыстасаваннем ювелірнай вытворчасці, гіркай разнавагай, гузікам (мал. 17). У непасрэднай блізасці выяўлены таксама дэталь фібулы, аплаўкі, акоўка, ключ, нож, фрагменты шкляных бранзалетаў, гіркі-разнавагі, нажніцы “скандынаўскія” і інш. Масавыя знаходкі – гэта фрагменты сценак ляпной і у меншай колькасці ганчарнай керамікі (гл. табл. 1). Комплекс археалагічных рэчаў сведчыць аб статуснасці гаспадара апісанага комплексу, які існаваў у X–XI стст.




**Малюнак 17. – Знаходкі з жыллёва-гападарчага комплексу 17-З**

**Высновы.** У раскопе 1 2014 г. на стрэлцы Ніжняга замка зафіксавана 17 жыллёва-гаспадарчых комплексаў X–XVIII стст. Найбольшая колькасць зафіксаваных комплексаў прыпадае на перыяд X–XIII стст. Шчыльнасць забудовы і стракатасць культурных напластаванняў саступае аналагічным ва ўсходняй частцы Верхняга замка, асабліва гэта тычыцца напластаванняў XII–XIII стст. Побач з даследаванай пляцоўкай (каля 20 м) у XII ст. будуецца царква і пачынаюць фарміравацца могілкі.

У канструкцыях печаў X–XIII стст. акрамя камянёў выяўлены фрагменты плінфы. Гэтая плінфа была пашкоджана і па гэтай прычыне не выкарыстоўваліся падчас будаўніцтва храма. Выкарыстанне плінфы ў канструкцыі полацкіх печаў з’яўляецца даволі распаўсюджанай з’явай у XII ст.

Падчас раскопак было высветлена, што ў драўляных дамах XI–XIII стст. на тэрыторыі Ніжняга замка будаваліся ў асноўным печы-каменкі. Печаў з гліны тут выяўлена менш. Па матэрыялах Верхняга

замка было заўважана, што ў XIII ст. будаваліся выключна глінабітныя печы на падрубах (апечках) [8, с. 46–47]. У перыяд XIV–XV стст. дадзенае месца не вызначаецца масавай гарадской забудовай. Відавочна, што акрэсленая пляцоўка знаходзілася пры царкве, і тут існавалі могілкі.

У канцы XV – першай палове XVI ст. адбываецца інтэнсіфікацыя ўзвядзення жылой забудовы. Магчыма, аднаўленне будаўніцтва звязана з актыўным дзеяннем маскоўскіх войскаў, якія ў 1508, 1513, 1518 гг. выпальвалі правабярэжныя пасады Полацка [4, с. 111]. На той час Ніжні замак з'яўляўся часткай Вялікага пасаду. Намі былі выяўлены сляды двух жыллёва-гаспадарчых комплексаў на адным месцы. Адбываюцца змены ў будаўніцтве – адна з жылых драўляных пабудоў пачатку XVI ст. была ўсталявана на каменным падмурку, што з'яўляецца самым раннім прыкладам выкарыстання каменнага падмурку ў драўляным дойлідстве Полацка.

Пасля Лівонскай вайны слядоў актыўнай забудовы XVII–XVIII стст. не зафіксавана. Выяўлены толькі 2 ЖГК у культурных пластах азначанага перыяду. На гэты перыяд прыпадае канчатковае разбурэнне храма XII ст.

ЛІТАРАТУРА

1. Дук, Д.У. Археалагічныя комплекы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. (па выніках раскопак 2004–2012 гг.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – 248 с.
2. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д.У. Дук // МАБ – 2011. – № 21.– С. 30–60.
3. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с.
4. Дук, Д.У. Экімань у сацыятапаграфічнай структуры Полацка XV–XVIII стст. / Д.У. Дук // МАБ. – 2011. – № 21. – С. 99–114.
5. Раппопорт, П.А. Полоцкое зодчество XII в. / П.А. Раппопорт // Советская археология. – 1980. – № 3 – С. 143–163.
6. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 183 с.
7. Штыхов, Г.В. Отчёт о раскопках на Полоцком городище и на мысах вдоль р. Полоты в 1962 г. / Г.В. Штыхов // Фонд археологичекой научной документации Центрального Научного Архива НАН Беларуси. – Д. 129.
8. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX-XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.

*Паступіў 30.11.2017*

## THE HOUSEHOLD COMPLEXES WITHIN THE TERRITORY OF THE LOWER CASTLE IN POLACK IN THE X$^{TH}$-XVIII$^{TH}$ CENTURIES (BASED ON THE RESULTS OF THE EXCAVATIONS IN 2014)

***A. KOTS***

*The archaeological research on the projection of the Lower Castle in Polack were conducted in 2014. During the excavations, the cultural layers of the X$^{th}$-XVIII$^{th}$ centuries as well as the cultural layers of the earlier period, the ancient cemeteries, the Polack tangible culture, the building material of the temple of the XII$^{th}$ century, etc. were explored. As a result, seventeen household complexes were defined. The cultural layer does not preserve organic substances, thus the complexes were determined with the remains of stoves, cultural layer marks, inland pits, ceramics concentration in the household area, etc. The largest number of the recorded complexes date back to the X$^{th}$-XIII$^{th}$ centuries. In addition to stones and clay, the ancient bricks (plinths) were used in the stove construction of the Old Russian period. In the beginning of the XVI$^{th}$ century the houses with stone foundation appeared. The projection of the Lower Castle in the XVII$^{th}$-XVIII$^{th}$ centuries has no features of the intensive housing development. This period is characterized by the final destruction of the temple of the XII$^{th}$ century.*

***Keywords:*** *Polack, the Lower Castle, the projection of the Lower Castle, household complexe, stove.*